БИБЛИОТЕКА
БГУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ "Залатая літара" ў намінацыі "Найлепшая шматтыражная газета"*

**17 верасня 2009 года, № 14 (2007)**

УРАЧЫСТАСЦІ

## Свята Кнігі ў Смаргоні

***Урачыстае свята Яе Вялікасці Кнігі – Дзень беларускага пісьменства – 6 верасня выпала прымаць Смаргоні, што ў Гродзенскай вобласці.***

У горад, які размешчаны на перапляценні дзвюх рэчак – Гярвяткі і Оксны, прыехала мноства гасцей, сярод якіх быў і рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка.

Свята пачалося з Божай Літургіі ў Саборы Праабражэння Гасподняга, куды прыбыла навукова-асветніцкая экспедыцыя "Дарога да святыняў" з нязгаснай лампадай. Пад малінавы перазвон адбылося асвячэнне Сабора, закладка Саду малітвы.

На цэнтральнай гарадской плошчы прайшла цырымонія ўрачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства з тэатралізаванай дзеяй, у якой "завіталі на свята" беларускі асветнік і паэт Францішак Багушэвіч, славуты кампазітар Міхал Клеафас Агінскі, а таксама князь Хрыстафор Зяновіч, які заснаваў у Смаргоні фабрыку па вытворчасці паперы яшчэ ў XVI ст. і меў вялікую асабістую бібліятэку.

Смаргоншчына – прыгожая зямля з багатымі гістарычнымі і духоўнымі традыцыямі: Крэўскі замак, радавы маёнтак Агінскіх, сядзіба ў Кушлянах, дзе жыў Францішак Багушэвіч...

Па традыцыі з нагоды свята ўвекавечваюцца ўраджэнцы краю, якія засталіся ў гістарычнай памяці народа, – велічны помнік Францішку Багушэвічу паўстаў на беразе Оксны.

Свята атрымалася маштабным. Цэнтр горада быў запоўнены кніжнымі экспазіцыямі, імправізаванымі сцэнічнымі пляцоўкамі. Працаваў "Горад майстроў", гучалі вершы, песні, музыка...

У гарадскім парку ладзіўся Фестываль кнігі і прэсы. Тут на спецыяльных пляцоўках разгарнуліся выставы кніг, газет, часопісаў. Выдавецтва БДУ таксама прапанoўвала універсітэцкія выданні, якія былі размешчаны ў тэматычных экспазіцыях, а таксама ў павільёне "Сучасная беларуская кніга".

Адбыліся прэзентацыі асобных кніг з удзелам аўтараў БДУ: І. Чароты, П. Навойчыка, А. Салькова, Г. Семянюк і гасцей з Сербіі і Чарнагорыі – літаратараў Н. Вітошавіч-Чэкліч і С. Вуканавіча.

Прадстаўніча ў нашай экспазіцыі выглядалі юбілейныя выпускі навуковага часопіса "Веснік БДУ", якому сёлета споўнілася 40 гадоў, а таксама нумары газеты "Універсітэт", якія разляцеліся ўмомант: былыя выпускнікі жадалі даведацца, чым жыве альма-матэр, а школьнікі цікавіліся ўмовамі паступлення ў вядучую ўстанову краіны.



*Рэктар БДУ С. Абламейка ля стэнда універсітэта*

З дапамогай супрацоўнікаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ А. Буцінай і Н. Карбановіч была праведзена віктарына "Мой універсітэт" і бяспройгрышная латарэя для дзяцей і дарослых.

Дзень беларускага пісьменства прапагандуе здабыткі айчыннай пісьмовай культуры, пераемнасць духоўных традыцый Беларусі, дае унікальную магчымасць сустрэцца з жывым словам, са сведкамі творчага працэсу стварэння кнігі, газеты, часопіса.

У наступным годзе свята перамесціцца ў г. Хойнікі Гомельскай вобласці, на радзіму народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа.

**Ірына ЛУК'ЯНЧЫК,
начальнік упраўлення
рэдакцыйна-выдавецкай работы**
Фота Наталлі Герасімовіч

## ГАЛЕРЭЯ

***Самабытная галерэя "Гісторыя беларускай пісьменнасці" пачала існаваць 4 верасня на філалагічным факультэце.***

Адкрыццё галерэі прымеркавана да Дня беларускай пісьменнасці, які ўрачыста адзначаецца з 1994 г.

Галоўныя падрыхтоўшчыкі – дацэнт Уладзімір Кароткі, старшы выкладчык Вольга Крычко, кафедра гісторыі беларускай літаратуры (загадчыца – дацэнт Таццяна Казакова). Мастацкім афармленнем стэндаў займалася леташняя выпускніца філфака Надзея Бышка. Аўтары праекта прысвяцілі яго таксама Году роднай зямлі і 70-годдзю факультэта.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, дэкан філалагічнага факультэта прафесар Іван Роўда, выкладчыкі і студэнты альма-матэр.

Экспазіцыя галерэі ахоплівае гісторыю беларускай пісьменнасці XI-XVII стст. і ўключае рэпрадукцыі рэдкіх кніг, выданняў і рукапісаў з бібліятэк нашай краіны, а таксама Расіі, Украіны, Літвы і Польшчы, у тым ліку першых навуковых філалагічных выданняў Беларусі – "Граматык" Лаўрэнція Зізанія, Мялеція Смятрыцкага і Іаана Ужэвіча. Сярод экспанатаў таксама выявы помнікаў перакладной і арыгінальнай літаратуры Беларусі трох эпох – Сярэднявечча, Адраджэння і барока. Прычым некаторыя з іх упершыню паказаны публіцы.

**Максім ВІЛЬТОЎСКІ**

Чытайце ў нумары:

ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ-2009 У БДУ
Стар. 2

МАЯ УНІВЕРСІТЭЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
Фундаментальная бібліятэка БДУ правяла да Дня бібліятэк шэраг адмысловых акцый
Стар. 5

УНІКАЛЬНАЯ ДУБРОВА ГІНЕ НА ВАЧАХ У СТУДЭНТАЎ
Шматлікія студэнты з філіяла БДУ ў "Гаі" ля Шчомысліцы не зважаюць, што на гэтай тэрыторыі знаходзіцца каштоўны прыродны комплекс рэспубліканскага значэння
Стар. 6

### ВУЧОНЫ САВЕТ

На пасяджэнні Вучонага савета БДУ *28 верасня* ў будынку рэктарата (вул. Бабруйская, 5а) будуць прысуджаны вучоныя званні, а таксама ўручаны дыплом ганаровага прафесара БДУ акадэміку РАН В.С. Сцёпіну. Пачатак у 10.15.

***

На пашыраным пасяджэнні Вучонага савета *5 кастрычніка* ў актавай зале Ліцэя БДУ будзе заслуханы даклад рэктара акадэміка НАН Беларусі Сяргея Абламейкі аб выніках работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 2008-2009 навуч. г. і задачах на 2009-2010 навуч. г. Пачатак у 10.15.

ІМПРЭЗЫ

## УЗБАГАЦІЛІСЯ МАСТАЦТВАМ

***Першакурснікі і актыў Белдзяржуніверсітэта 4 верасня сталі першымі гледачамі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў новым тэатральным сезоне.***


*Першы прарэктар БДУ Міхаіл Журaўкоў дзеліцца ўражаннямі ад спектакля*

Спектаклем-адкрыццём стала легендарная "Паўлінка". Паказ прайшоў у рамках акцыі "Першы тэатр – першай ВНУ", якую ініцыявала пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ. Гледачоў і акцёрскі калектыў віталі віцэ-прэм'ер Уладзімір Патупчык, міністр культуры Беларусі Павел Латушка, намеснік міністра адукацыі Таццяна Кавалёва, старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Уладзімір Бойка, а таксама першы прарэктар БДУ Міхаіл Журaўкоў.

Павел Латушка адзначыў, што сам з'яўляецца выпускніком юрыдычнага факультэта БДУ і шчыра гэтым ганарыцца. "Я спадзяюся, што вы таксама будзеце высока несці званне студэнта БДУ, памятаць пра тое, што гэтыя гады вельмі важныя ў жыцці. Вы павінны набыць веды, карысныя на вашым будучым шляху", – наказаў міністр культуры і павіншаваў усіх са святам мастацтва.

Затым слова ўзяла намеснік міністра адукацыі Таццяна Кавалёва: "Камедыя «Паўлінка» – гэта не толькі візітоўка купалаўскага тэатра. Гэта, упэўнена, любімы твор усёй беларускай моладзі. Бо і сёння "Паўлінка" гучыць для нас вельмі актуальна. Вялікі дзякуй калектыву тэатра, што ён захоўвае традыцыі, вялікі дзякуй за гэтую сучаснасць, за ўвагу да моладзі. Мы зычым усім творчасці, добрага настрою і сапраўднага чалавечага кахання!"

Наступныя дзве гадзіны ішоў спектакль. Пастаўлены ўпершыню яшчэ ў 1943 г. у Томску, ён і сёння захапляў залу. Падчас спектакля адчувалася эмацыйная еднасць гледачоў. Перажыванні і смех, сімпатыі і брыдкасць – дзякуючы акцёрам ажылі ўсе нашыя пачуцці! Моцныя няўмоўкныя апладысменты, выкрыкі "брава!" і "біс!", завароджаныя твары гледачоў заклікалі майстроў тэатра зноў і зноў выходзіць на паклон.

Пасля выступлення на сцэну выйшаў першы прарэктар БДУ Міхаіл Журaўкоў. Ён узгадаў, што і сам на першым курсе хадзіў глядзець спектакль і атрымаў сапраўднае задавальненне. З таго часу ён неаднаразова перагледжваў пастаноўку і вельмі ўдзячны тэатру "за нашу родную мову, за гэтую неўмірчую Паўлінку, за спектакль". Міхаіл Журaўкоў адзначыў: "Мы ва універсітэце лічым, што павінны не толькі выхоўваць прафесіянала, не толькі даць добрыя веды, але і выпусціць у свет чалавека духоўна развітага, культурнага і адданага сваёй Радзіме. Таму дзякуй нашаму вядучаму тэатру! Тут вельмі шмат першакурснікаў, для якіх тэатр стане другім пасля універсітэта домам, які яны будуць часта наведваць, узгадваць і вадзіць сюды сваіх дзяцей і ўнукаў".

Пасля прэм'еры, гледзячы на шчаслівыя твары моладзі, я зразумела, што сувязь паміж тэатрам і галоўнай ВНУ сапраўды моцная і, спадзяюся, ніколі не парвецца.

**Марына САВІЦКАЯ**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА


*Узрушаныя студэнты дзякуюць артыстам Купалаўскага тэатра*

АФІЦЫЙНА

# ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ Ў БДУ 2009 г.

**У 2009 г. на ўсе формы навучання залічана 6119 абітурыентаў (у 2008 г. – 5953).**

Структура прыёму наступная: на дзённую форму навучання залічана 4352 (у 2008 г. – 4357), у тым ліку на бюджэтную форму – 1995 (у 2008 г. – 1925), на платную форму – 2357 (у 2008 г. – 2432); а на завочную форму навучання – 1767 (у 2008 г. – 1596), у тым ліку на бюджэтную форму – 378 (у 2008 г. – 368), на платную форму – 1115 (у 2008 г. – 969); для атрымання другой вышэйшай адукацыі – 274 (у 2008 г. – 259).



Рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка з першымі новымі студэнтамі універсітэта

## МАШТАБЫ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ

Прыёмная кампанія 2009 г. пачалася ў сакавіку і завяршылася ў сярэдзіне жніўня. Характэрная асаблівасць мінулай прыёмнай кампаніі – істотны рост колькасці абітурыентаў, якія ўдзельнічаюць у ёй, у прыватнасці:

– для праходжання прафесійна-псіхалагічнага сумоўя ў БДУ зарэгістравалася 4247 абітурыентаў (у 2008 г. – 3829);

– агульны лік зарэгістраваных удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання ў БДУ склаў 19651 (у 2008 г. – 18371);

– на розныя формы атрымання вышэйшай адукацыі было пададзена 11066 заяў ад абітурыентаў (у 2008 г. – 10170).

У мерапрыемствах прыёмнай кампаніі ўдзельнічала вялікая колькасць супрацоўнікаў універсітэта. У прыватнасці, у прафесійна-псіхалагічным сумоўі ўдзельнічала 170 выкладчыкаў, у цэнтралізаваным тэсціраванні – 493, у працы прадметных камісій, прыёмнай камісіі і сакратарыята – 165. Рэгістрацыю на прафесійна-псіхалагічнае сумоўе, цэнтралізаванае тэсціраванне і прыём дакументаў здзяйсняў навучальна-дапаможны персанал – 255 супрацоўнікаў. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ажыццяўлялі супрацоўнікі адміністрацыйна-гаспадарчых службаў – 135 супрацоўнікаў. Акрамя таго, для правядзення прафесійна-псіхалагічнага сумоўя прыцягваліся 44 вядучыя спецыялісты міністэрстваў і ведамстваў.

Неабходна таксама адзначыць вялікую працу, зробленую студэнцкім актывам універсітэта: на працягу шасці месяцаў у апаратыўным атрадзе працавала 70 і ў грамадскай прыёмнай камісіі – 90 студэнтаў.

## ПРАФАРЫЕНТАЦЫЙНАЯ ПРАЦА

На працягу ўсяго мінулага навучальнага года дэканатамі факультэтаў і сакратарыятам прыёмнай камісіі праведзена значная прафарыентацыйная праца, найбольш істотныя мерапрыемствы якой наступныя:

– правядзенне факультатыўных заняткаў і прафарыентацыйнай працы на аснове дамоў аб супрацоўніцтве, уключаючы педагагічную практыку з 4 ліцэямі, 36 школамі, 22 гімназіямі г. Мінска і 34 школамі краіны;

– удзел у падрыхтоўцы і правядзенні алімпіяд, творчых конкурсаў і турніраў рознага ўзроўню (гарадскіх, раённых, абласных, рэспубліканскіх);

– праца "Школ юных" і "Школ абітурыентаў" на прыродазнаўчых факультэтах;

– удзел у арганізацыі і правядзенні 13-ай Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў па матэматыцы, інфарматыцы, фізіцы, астраноміі, хіміі, біялогіі;

– правядзенне факультэтамі алімпіяд "Абітурыент БДУ–2009";

– правядзенне online-канферэнцый для абітурыентаў на парталах БелТА, "СБ – Беларусь сегодня", БДУ;

– удзел у выставах "Адукацыя і кар'ера";

– удзел у злётах выпускнікоў школ і раённых днях прафарыентацыі;

– правядзенне "Дзён адкрытых дзвярэй" на факультэтах і ў інстытутах БДУ;

– арганізацыя інтэрактыўнай старонкі для абітурыентаў на сайце БДУ.

## ПРЫЁМ НА ДЗЁННУЮ БЮДЖЭТНУЮ ФОРМУ

Конкурс абітурыентаў на дзённую бюджэтную форму склаў па ВНУ 2,3 чалавека на месца (у 2008 г. – 2,6, у 2007 г. – 3,2, у 2006 г. – 2,6).

Сярод факультэтаў прыродазнаўчанавуковага профілю самы высокі конкурс – 2,1 чалавека на месца – на біялагічным факультэце; на механіка-матэматычным факультэце і хімічным факультэце – 1,8.

Самы высокі конкурс у БДУ зафіксаваны на гуманітарным факультэце на спецыяльнасці "дызайн (кірунак – камунікатыўны дызайн)" – 17 (у 2008 г. – 16,6). Стабільна высокі конкурс на папулярных сярод абітурыентаў спецыяльнасцях факультэта міжнародных адносін: "міжнародныя адносіны" – 6,3; "міжнароднае права" – 5,4.

Сярэдні бал атэстата абітурыента дзённай бюджэтнай формы навучання склаў 8,7 (у 2008 – 8,5).

У паўтара разы ў параўнанні з 2008 г. павялічылася сярод абітурыентаў колькасць медалістаў.

Сярэдні бал атэстата студэнта першага курса дзённай бюджэтнай формы навучання склаў 9,0 (у 2008 г. – 8,9), прычым у студэнтаў факультэта міжнародных адносін і эканамічнага факультэта – 9,5.

Без іспытаў залічана 168 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (у 2008 г. – 123). Сярод іх 13 з'яўляюцца пераможцамі міжнародных алімпіяд, 7 – лаўрэатамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. А усяго ў ВНУ краіны было прынята 310 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд. 1 жніўня, у апошні дзень залічэння на дзённую бюджэтную форму навучання, 16 пераможцам міжнародных алімпіяд і лаўрэатам спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь уручаны студэнцкія білеты.

Без іспытаў таксама залічаны 4 абітурыенты, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі беларускай дыяспары Літвы і Латвіі, у адпаведнасці з міжнароднымі пагадненнямі аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі.

Сярод залічаных 20 % скончылі школу з залатым або сярэбраным медалём (у 2008 г. – 15 %), 56 % скончылі ліцэі і гімназіі (у 2008 г. – 44 %), кожны другі студэнт 1 курса набраў больш за 300 балаў. Трэба зазначыць, што практычна кожны пяты медаліст і ліцэіст краіны, які паступіў на бюджэтную форму навучання, паступіў у наш універсітэт. Самы высокі бал быў зафіксаваны ў абітурыенткі спецыяльнасці "міжнародныя адносіны", выпускніцы ліцэя г. Бабруйска – 392.

Добрыя вынікі паказалі выпускнікі сельскіх школ: 36% абітурыентаў залічана па аб'яднаным конкурсе, бо ў сельскіх абітурыентаў быў вышэйшы прахадны бал, чым у гарадскіх абітурыентаў, у прыватнасці, на геаграфічным факультэце, гістарычным факультэце, факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, фізічным факультэце, на большасці спецыяльнасцяў філалагічнага факультэта. Усяго залічаны 184 абітурыенты з сельскіх школ, 58 з іх набралі 300 балаў і больш. Спіс залічаных на спецыяльнасць "кампутарная бяспека" факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі адкрывае сельскі абітурыент з балам 368; на спецыяльнасці "міжнародная журналістыка" спіс адкрываюць два абітурыенты, выпускнікі сельскіх школ, з баламі адпаведна 46,2 і 41,7.

Па-за конкурсам залічана 69 абітурыентаў ільготных катэгорый, што складае 3,5 % ад залічаных (у 2008 г. – 68).

Сярод прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцяў самы высокі прахадны бал – 358 – зарэгістраваны на спецыяльнасці "кампутарная бяспека" факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (у 2008 г. – 352). Сярод гуманітарных спецыяльнасцяў самы высокі прахадны бал (353) зафіксаваны на спецыяльнасці "інфармацыя і камунікацыя" факультэта філасофіі і сацыяльных навук (у 2008 г. – 344). Сярод эканамічных спецыяльнасцяў – 357 – на спецыяльнасці "сусветная эканоміка" (у 2008 г. – 344). Сярод спецыяльнасцяў з творчым конкурсам самы высокі прахадны бал 41,2 на спецыяльнасці "дызайн (кірунак – камунікатыўны дызайн)".

Выкананы план мэтавага набору – залічана 11 студэнтаў.

## ПРЫЁМ НА ЗАВОЧНУЮ БЮДЖЭТНУЮ ФОРМУ

Сярэдні конкурс на завочную бюджэтную форму склаў 1,6 абітурыента на месца (у 2008 г. – 1,7). Самыя высокія конкурсы зафіксаваныя на наступных спецыяльнасцях:

– "музейная справа" – 2,4;

– "правазнаўства", "біялогія" – 2,3;

– спецыяльнасці эканамічнага факультэта – 2,1.

Разам з тым адсутнічаў конкурс на наступных спецыяльнасцях: "гісторыя", "журналістыка (аўдыёвізуальныя СМІ)", "сацыялогія", "філасофія", "беларуская філалогія", "руская філалогія".

На завочную бюджэтную форму залічана 378 студэнтаў, недавыкананне плана склала 47 (у 2008 г. – 57).

Самыя высокія прахадныя балы на завочную бюджэтную форму:

– "біяэкалогія" – 219,

– "музейная справа" – 203,

– "сацыяльная праца" – 195,

– "біялогія" – 194,

– "правазнаўства" – 191.

## ПРЫЁМ НА ДЗЁННУЮ ПЛАТНУЮ ФОРМУ

На дзённую платную форму навучання конкурс у цэлым па ВНУ склаў 1,4 чалавека на месца (у 2008 г. – 1,2). Традыцыйна высокі конкурс (2 і больш чалавека на месца) зафіксаваны на спецыяльнасцях эканамічнага профілю і профілю "міжнародныя адносіны", а менавіта:

– "менеджмент (спецыялізацыя – сацыяльны менеджмент)" – 3,0;

– "міжнародныя адносіны" – 2,9;

– "менеджмент" ДзІКСТ – 2,6;

– "міжнароднае права", "лінгвакраіназнаўства" – 2,4;

– спецыяльнасці эканамічнага факультэта, "менеджмент (спецыялізацыя – менеджмент у сферы міжнароднага турызму)", "лагістыка" – 2,0.

Вынікам такога высокага для платнай формы конкурсу сталі высокія прахадныя балы на шэраг спецыяльнасцяў, а менавіта:

– "міжнароднае права" – 299;

– "міжнародныя адносіны", "лінгвакраіназнаўства" – 293;

– "сусветная эканоміка", "менеджмент (спецыялізацыя – менеджмент у сферы міжнароднага турызму)" – 276;

– "бізнэс-адміністраванне" – 250;

– "лагістыка" – 246;

– спецыяльнасці эканамічнага факультэта – 245.

Сярэдні бал атэстата студэнта першага курса дзённай платнай формы навучання склаў 8,4 (у 2008 г. – 8,3).

Сярод залічаных 119 скончылі школу з залатым або сярэбраным медалём (у 2008 г. – 61), 39 % скончылі ліцэі і гімназіі (у 2008 г. – 30 %), больш за 300 балаў набраў 221, што складае 9,4 %.

Аднак неабходна мець на ўвазе наяўнае значнае стартавае адрозненне ва ўзроўні падрыхтоўкі студэнтаў бюджэтнай і платнай формы. Пра гэта сведчаць, у прыватнасці, наступныя вынікі здачы ЦТ: па матэматыцы сярэдні бал склаў у бюджэтніка 72, а ў студэнта платнай формы толькі 50, і такое адрозненне ў 20, а то і ў 30 балаў назіраецца практычна па ўсіх агульнаадукацыйных прадметах.

## ПРЫЁМ НА ЗАВОЧНУЮ ПЛАТНУЮ ФОРМУ

На завочную платную форму навучання конкурс у цэлым па ВНУ склаў 1,6 чалавека на месца, як і ў 2008 г.

Самыя высокія конкурсыназіраліся на спецыяльнасці:

– "правазнаўства" – 2,7;

– "біяэкалогія" – 2,4;

– "біялогія", "менеджмент (сацыяльны менеджмент)", "музейная справа", спецыяльнасці эканамічнага факультэта – 2,1;

Самыя высокія прахадныя балы на наступных спецыяльнасцях:

– "правазнаўства" – 195;

– "біяэкалогія" – 182;

– "біялогія" – 176;

– "музейная справа" – 174;

– спецыяльнасці эканамічнага факультэта – 154.

Гэткая ж, як і ў мінулыя гады, высокая цікавасць да атрымання ***другой вышэйшай адукацыі***, асабліва па спецыяльнасцях правазнаўчага і эканамічнага профілю. Сёлета для атрымання другой вышэйшай адукацыі залічана 275 студэнтаў (у 2008 г. – 259). Пры гэтым назіраліся досыць высокія конкурсы, у прыватнасці, на спецыяльнасцях:

– "бізнэс-адміністраванне" – 2,0;

– "лагістыка" – 1,9;

– "правазнаўства" – 1,6;

– "менеджмент", "фінансы і крэдыт" – 1,4.

## ПРЫЁМ У ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ

Уступныя выпрабаванні ў юрыдычны каледж БДУ праводзіліся на адну спецыяльнасць – правазнаўства. Прыём здзяйсняўся на аснове агульнай базавай адукацыі (план прыёму на бюджэтныя месцы 50 чалавек) і на аснове агульнай сярэдняй адукацыі (план прыёму на бюджэтныя месцы 25 чалавек), на завочную бюджэтную форму на базе сярэдняй адукацыі (20 чалавек). Усяго было пададзена 926 заяў, у тым ліку 787 ад тых, хто мае агульную базавую адукацыю, 126 ад тых, хто мае агульную сярэднюю адукацыю і паступае на дзённую форму, і 13 ад тых, хто мае агульную сярэднюю адукацыю і паступае на завочную форму. Конкурс сярод выпускнікоў базавых школ склаў 15,7 чалавека на месца, а сярод выпускнікоў СШ – 5,04.

На дзённую бюджэтную форму навучання ў юрыдычны каледж на аснове базавай адукацыі залічана 50 чалавек; на дзённую бюджэтную на аснове сярэдняй адукацыі – 25 чалавек; на завочную бюджэтную форму – 20 чалавек.

## ПРЫЁМ ЗАМЕЖНЫХ ГРАМАДЗЯН

У адпаведнасці з дзейнымі Правіламі прыёму залічэнне замежных грамадзян у ВНУ здзяйсняецца да 15 кастрычніка, але некаторыя вынікі можна падвесці. На дзённае аддзяленне ўжо залічана 313 студэнтаў (у 2008 г. – 298) з 22 краін свету, сярод іх 65% складаюць грамадзяне Кітая, 23% – грамадзяне Туркменістана.

Вучоны савет БДУ, які разглядзеў 7 верасня вынікі прыёмнай кампаніі, у цэлым адобрыў працу прыёмнай камісіі і сакратарыята па арганізацыі прыёму на 1 курс і разам з тым звярнуў увагу кіраўніцтва факультэтаў на неабходнасць пашырэння пераліку спецыяльнасцяў (кірункаў спецыяльнасцяў і спецыялізацый) па ўсіх формах атрымання адукацыі, павышэнні эфектыўнасці ўсіх формаў маркетынгавай і прафарыентацыйнай працы. У найбліжэйшыя гады трэба чакаць узмацнення канкурэнцыі на рынку адукацыйных паслуг з прычыны дэмаграфічных працэсаў, у прыватнасці, скарачэння колькасці выпускнікоў школ больш чым на 20 тысяч ужо ў 2010 г.

**Адказны сакратар прыёмнай камісіі Л.М. ХУХЛЫНДЗІНА, першы намеснік адказнага сакратара В.М. МАЛАФЕЕЎ**

# Абвешчаны чарговы конкурс заявак на сумесныя праекты ў VII Рамачнай праграме ЕС

***Еўрапейская Камісія 30 ліпеня 2009 г. адкрыла новы тур падачы заявак на конкурс навуковых праектаў па ўсіх кірунках Сёмай Рамачнай праграмы. Часткай гэтага конкурсу з'яўляюцца і праекты па сацыяльна-эканамічных і гуманітарных дысцыплінах. Паколькі конкурс абвешчаны, гэта азначае, што тыя беларускія навукоўцы, якія хацелі б прыняць удзел у сумесных праектах з калегамі з краін Еўрасаюза, павінны актывізаваць свае намаганні па пошуку адпаведных партнёраў па тэматыцы, якая вызначана прыярытэтнай у дадзеным туры.***

Сёмая Рамачная праграма ЕС (FP7) існуе з 2007 г. Гэта адзін з галоўных каналаў фінансавання навукоўцаў і скіроўвання іх высілкаў у рэчышча праблем, цікавых перш за ўсё для самога Еўрапейскага Саюза. Праграма фінансуецца галоўным чынам сродкамі ЕС. Беларусь была запрошана да ўдзелу ў рамачных праграмах у якасці "трэцяй краіны" нароўні з Расіяй, Ізраілем, Турцыяй і інш. Аднак Беларусь (у адрозненне ад указаных вышэй трэціх краін) не робіць фінансавага ўкладу ў рамачную праграму, таму на сёння ніякіх адмысловых падпраграм для прыярытэтнага ўдзелу беларускіх навукоўцаў няма.

Удзел беларускіх навукоўцаў у праграмах FP7 досыць абмежаваны, бо для поспеху неабходна мець партнёраў у краінах ЕС або Асацыяваных Краінах, якія запрасілі б беларусаў у свой кансорцыум. Беларусы могуць толькі далучацца, самі яны не маюць права ініцыяваць які-небудзь праект. Інакш кажучы, беларускія навукоўцы не могуць быць каардынатарамі праектаў. Аднак яны могуць ініцыяваць новы праект, калі маюць партнёраў з ЕС і зацікаўленыя ў міжнародным навуковым супрацоўніцтве.

Сёння, на жаль, далёка не ўсе нашы акадэмічныя і універсітэцкія навукоўцы па сацыяльна-эканамічных і гуманітарных дысцыплінах выяўляюць такую зацікаўленасць. Як паказала сацыялагічнае даследаванне, праведзенае сярод навукоўцаў Беларусі ў дадзеным кірунку, прыкладна чвэрць прымае хоць нейкі ўдзел у міжнародным супрацоўніцтве (часцей за ўсё гэта ўдзел у канферэнцыях, у апошні час – навуковыя абмены, радзей сумесныя публікацыі, і яшчэ радзей – рэальныя навукова-даследчыя праекты з удзелам некалькіх краін). Многім з нашых навукоўцаў бракуе ведання замежнай мовы, некаторым – досведу (і навуковага, і менеджэрскага), але большасць скардзіцца на адсутнасць неабходнай інфармацыі для ўключэння ў міжнароднае супрацоўніцтва. Дадзены артыкул закліканы папоўніць недахоп інфармацыі – інфармаваць навуковую супольнасць пра новы конкурс і стымуляваць уключэнне ў міжнароднае супрацоўніцтва тых навукоўцаў БДУ, хто па сваім патэнцыяле гатовы да гэтага ўзроўню навуковай дзейнасці.

Галоўная задача для тых, хто жадае ўдзельнічаць, – мець патэнцыйных заходніх партнёраў і каардынатараў задоўга да таго, як будзе абвешчаны новы конкурс па FP7. Гэтае правіла аднолькавае ў дачыненні да ўсіх навук. Але можна спрабаваць уключыцца ў праекты і тады, калі конкурс абвешчаны, як зараз.

У Рэспубліцы Беларусь дзейнічае Нацыянальны інфармацыйны офіс па супрацоўніцтве з 7РП пры БелІСА пад кіраўніцтвам В.А. Меяроўскай, які аказвае беларускім навукоўцам інфармацыйную і іншую дапамогу па ўсіх кірунках навуковай кааперацыі. Дадаткова па шэрагу навуковых кірункаў загадам ДКНТ створаныя так званыя "кантактныя кропкі" па супрацоўніцтве з Сёмай рамачнай праграмай. З 2007 г. у БДУ на факультэце філасофіі і сацыяльных навук створаная такая кропка (на грамадскіх пачатках) па сацыяльна-эканамічных і гуманітарных дысцыплінах. Непасрэдна пытаннямі супрацоўніцтва і каардынацыі займаецца прафесар Л.Р. Цітарэнка. Энтузіясты з іншых факультэтаў, якія хочуць паўдзельнічаць у працы кантактнай кропкі, могуць таксама ўключацца ў гэтую дзейнасць.

Задачы кропкі – інфармацыйная і каардынацыйная: прапанаваць зацікаўленым навукоўцам інфармацыю пра праекты, пракансультаваць іх па пытанні пошуку партнёраў, падачы праекта, удзелу ў тых або іншых мерапрыемствах, якія праводзяцца функцыянерамі 7РП або навуковымі падраздзяленнямі нашай краіны. Вядома, кропка не ў стане дапамагчы ў напісанні навуковага праекта або пратэжаваць яго ў 7РП – толькі навуковы капітал саміх даследчыкаў можа дапамагчы ў такіх пытаннях. Аднак пашырыць гарызонты пошуку крыніц фінансавання за межамі Беларусі, скіраваць маладых перспектыўных навукоўцаў на шлях кааперацыі з калегамі з іншых краін, агучыць прыярытэтныя навуковыя праблемы мы здольныя.

Кантактная кропка атрымлівае інфармацыю з офіса 7РП адносна таго, наколькі актыўна і паспяхова Беларусь уключаецца ў сумесныя праекты. Своечасовае давядзенне гэтай інфармацыі да беларускай навуковай супольнасці і яго кіраўнікоў таксама спрыяе актывізацыі нашага ўдзелу ў міжнародных праектах і рэфлексіі наконт поспехаў і недахопаў.

*Прывяду прыклад.* Па сацыяльна-эканамічных і гуманітарных навуках (SSH) у 7РП з 2008 г. атрымалі фінансаванне 3 праекты, усе тры – з БДУ. БДУ як флагман беларускай навукі і адукацыі знаходзіцца на першым плане міжнароднай кааперацыі. Цяпер (2009) яшчэ два праекты з БДУ па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах знаходзяцца на стадыі зацвярджэння ў ЕС, г.зн. іх шанец атрымаць фінансаванне таксама вялікі. Той факт, што ўсе SSH праекты – мінскія, ды яшчэ з БДУ, не з'яўляецца дзіўным. Практычна такая ж карціна назіраецца ў іншых краінах СНД. Напрыклад, усе расійскія праекты, якія атрымалі фінансаванне па 7РП, выконваюцца навукоўцамі з Масквы (больш за 80%) і Санкт-Пецярбурга (астатнія 20%), хоць у падачы заявак, вядома, удзельнічаюць шматлікія прадстаўнікі расійскіх рэгіёнаў.

Назаву тэматыку праектаў, каб лягчэй было зразумець, якога роду фармулёўкі праектаў з'яўляюцца паспяховымі:

**1)** Транснацыянальная кааперацыя паміж нацыянальнымі кантактнымі кропкамі па сацыяльна-эканамічных і гуманітарных дысцыплінах;

**2)** Узаемадзеянне еўрапейскай, нацыянальнай і рэгіянальнай ідэнтычнасцяў: нацыі паміж дзяржавамі на новай усходняй мяжы Еўрасаюза;

**3)** Здароўе і стыль жыцця ў новых незалежных дзяржавах ва ўмовах трансфармацыі;

**4)** Рэлігійныя і секулярныя каштоўнасці насельніцтва Еўропы;

**5)** Еўрапейскія мовы ў эпоху глабалізацыі.

Што датычыцца названых тэм, яны маюць значны сацыялагічны складнік. Прычына гэтага ў тым, што сацыёлагі БДУ больш актыўныя ў 7РП, чым прадстаўнікі іншых дысцыплін – эканамічнай навукі, права, гісторыі і г.д. Хоць у цэлым у 7РП ніякага прыярытэту сацыёлагі не маюць. Мабыць, іншыя дысцыпліны яшчэ проста недастаткова ўключыліся ў гэты тып навуковага міжнароднага супрацоўніцтва.

Можна сказаць, што беларускія навукоўцы ў галіне сацыяльна-эканамічных дысцыплін досыць паспяховыя: працэнт праектаў, якія атрымалі фінансаванне з ліку пададзеных праектаў з удзелам беларусаў, нават вышэйшы, чым у цэлым па ўсіх навуковых кірунках 7РП па краіне.

**НОВЫ КОНКУРС ПА САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ГУМАНІТАРНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ (SSH)**

Еўрапейская Камісія сумесна з навуковай супольнасцю распрацавала так званы "новы падыход" да сацыяльна-гуманітарнай сферы, ускладаючы на яе больш спадзяванняў у аналізе і вырашэнні праблем і выклікаў, якія стаяць перад Еўропай: (гл. *http://ec.europa.eu/research/social-sciences/societal-challenges_en.html*). Усе праекты павінны даваць адказы на гэтыя выклікі ў кароткатэрміновай або сярэднетэрміновай перспектыве. Кожны буйны інтэграцыйны даследчы праект павінен быць скіраваны на некалькі спецыфічных аспектаў таго або іншага Выкліку (г. зн. структура буйнамаштабнага праекта ўключае шэраг дробных праектаў па падобных праблемах). Як сказана ў адмысловым дакуменце, падрыхтаваным па гэтым пытанні, буйныя праекты павінны ўключаць мноства перспектыў для вывучэння розных вымярэнняў Выкліку праз міждысцыплінарны падыход, быць заснаваныя на ранейшых даследаваннях, але арыентаваныя ў будучыню, уключаць не толькі партнёраў з краін Еўропы, але і іншых рэгіёнаў свету, мець практычную значнасць для грамадзянскай супольнасці, СМІ, сацыяльнай палітыкі. Дадаткова падкрэсліваецца неабходнасць выдатнага менеджменту такіх буйных праектаў, прытрымліванне гендэрных парытэтаў і этычных прынцыпаў ва ўзаемаадносінах паміж навукоўцамі розных краін.

Была распрацавана і прапанавана навуковай супольнасці так званая "стратэгічная дарожная карта даследаванняў" – дакумент, які вызначае стратэгіі і прыярытэты даследаванняў на некалькі гадоў наперад. Тым, хто мяркуе і далей удзельнічаць у конкурсах 7РП, будзе карысна азнаёміцца з гэтай "дарожнай картай":

*http://ec.europa.eu/research/social-sciences/indicative-strategic-research-roadmap_en.html.*

Абвешчаныя 30 ліпеня 2009 г. конкурсы па SSH (так званая Тэма 8) можна падзяліць па тыпах навуковых праектаў на некалькі груп, якія адрозніваюцца як па ўзроўні арганізацыі, так і па фінансаванні. Каротка ахарактарызуем іх паводле тыпу праектаў.

**1.** FP7-SSH-2010-1
Дата абвяшчэння – 30 ліпеня 2009
Дата падачы праектаў – 2 лютага 2010
Бюджэт: 40 млн еўра
Тып конкурсу: сумесныя праекты (буйнамаштабныя інтэграцыйныя даследчыя праекты – як правіла, каля 10 і больш удзельнікаў з розных краін ЕС і за яго межамі)

**2.** FP7-SSH-2010-2
Дата абвяшчэння – 30 ліпеня 2009
Дата падачы праектаў – 2 лютага 2010
Бюджэт: 18,9 млн еўра
Тып конкурсу: сумесныя праекты (малыя або сярэднія даследчыя праекты)

**3.** FP7-SSH-2010-3
Дата абвяшчэння – 30 ліпеня 2009
Дата падачы праектаў – 2 лютага 2010
Бюджэт: 8,1 млн еўра
Тып конкурсу: сумесныя праекты (малыя або сярэднія даследчыя праекты), скіраваныя на спецыфічныя сумесныя дзеянні ў рамках міжнароднага супрацоўніцтва

**4.** FP7-SSH-2010-4
Дата абвяшчэння – 30 ліпеня 2009
Дата падачы праектаў – 15 снежня 2009
Бюджэт: 3,6 млн еўра
Тып конкурсу: каардынацыйныя дзеянні (праекты для стварэння сетак паміж навукоўцамі, каардынатарамі і г.д.)

**5.** FP7-OCEAN-2010
Дата абвяшчэння – 30 ліпеня 2009
Дата падачы праектаў – 14 студзеня 2010
Бюджэт: 34 млн еўра (на ўдзел у іх навукоўцаў па SSH з бюджэту Тэмы 8 узяты 1 млн еўра)
Тып конкурсу: сумесны праект "Акіян заўтрашняга дня"

Зыходзячы з узроўню фінансавання, беларускія навукоўцы маюць нядрэнныя шанцы на ўдзел у першых трох групах праектаў. Аднак калі ёсць створаная раней навуковая сетка, то можна паспрабаваць падаць заяўку і па іншых кірунках.

Па тэматыцы праектаў яны падзелены на восем частак:

**1.** Рост, занятасць і канкурэнтаздольнасць у грамадстве ведаў – Еўрапейскі выпадак.

**2.** Злучэнне эканамічных, сацыяльных і прыродаахоўных мэт у еўрапейскай перспектыве – шлях да ўстойлівага развіцця.

**3.** Асноўныя тэндэнцыі ў грамадстве і іх вынікі.

**4.** Еўропа ў свеце.

**5.** Грамадзяне Еўрапейскага Саюза.

**6.** Сацыяльна-эканамічныя і навуковыя індыкатары.

**7.** Прагнастычная дзейнасць (прадбачанне).

**8.** Гарызантальныя дзеянні.

Даследчыкі з "трэціх краін" могуць удзельнічаць у любой тэме праекта. Асаблівую ўвагу такіх даследчыкаў павінны прыцягнуць тэмы ў раздзеле 4: Еўропа ў свеце. Аднак любы даследчы праект павінен адпавядаць базавым патрабаванням: шырокая параўнальная перспектыва і максімальна вялікае прыцягненне еўрапейскіх удзельнікаў, выкарыстанне колькасных і якасных метадаў аналізу, міждысцыплінарны падыход да праблем, прыцягненне да ўдзелу ў рэалізацыі праекта "карыстальнікаў" навуковай інфармацыі, зацікаўленых у гэтых выніках, распрацоўка стратэгіі для прэзентацыі дадзеных і вынікаў праекта для ўсёй навуковай супольнасці.

Акрамя тэм, непасрэдна ўказаных у тэматыцы конкурсу пад рубрыкай Тэма 8 (г.зн. як SSH), сацыяльная тэматыка мае месца ў праграмах па здароўі, устойлівым развіцці, развіцці сельскай гаспадаркі, новых інфармацыйных тэхналогій і інш. Падрабязней гэтыя дадатковыя тэмы і магчымасці выкладзеныя ў адмысловым дакуменце, падрыхтаваным для адкрытага доступу на сайце:

*http://www.net4society.eu/public/documents/opportunities2010.*

Тыя навукоўцы, у каго ёсць творчыя ідэі, тэматычна адпаведныя распачатаму туру конкурсу, павінны ўважліва праглядзець матэрыялы, вывешаныя на сайце 7РП, і пачаць (або працягнуць) актыўны пошук партнёраў і падрыхтоўку заяўкі.

У рамках кожнага даследчага кірунку пасля абвяшчэння новага тура конкурсу праводзяцца так званыя біржы праектных ідэй, дзе сустракаюцца навукоўцы, якія ўжо маюць канкрэтныя планы на падачу праекта па абвешчанай тэматыцы. Па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах такая біржа адбудзецца ў Брусэлі 16 кастрычніка. Яна будзе прысвечана галоўным чынам тром буйнамаштабным інтэграваным праектам, абвешчаным 30 ліпеня, – фінансавая сістэма ў сучасным грамадстве, схільнасці і стылі жыцця ў сучасных еўрапейскіх краінах і шматпалярны свет. Такія біржы называюць "пунктам сустрэчы" навукоўцаў, прадстаўнікоў арганізацый грамадзянскай супольнасці (бо ў праектах могуць удзельнічаць прадстаўнікі малых фірмаў, няўрадавых арганізацый нароўні з акадэмічнымі навукоўцамі) і прадстаўнікоў дзяржаўных арганізацый, якія займаюцца распрацоўкай сацыяльнай палітыкі. Падобныя сустрэчы дапамагаюць патэнцыйным партнёрам знайсці адзін аднаго, стварыць плённыя кансорцыумы і затым падаць моцную заяўку.

Для ўдзелу ў біржы перспектыўныя патэнцыйныя ўдзельнікі (тыя, у каго ёсць ідэі, досвед і сродкі для ўдзелу ў біржы) павінны загадзя зарэгістравацца на сайце біржы, каб яе арганізатары змаглі скласці графікі сустрэч зацікаўленых асоб "тварам у твар". Акрамя такіх сустрэч, падчас ранішняга пасяджэння біржы будзе ажыццёўленая кароткая прэзентацыя новага падыходу Еўракамісіі да сацыетальных праблем. Затым па ўказаных трох кірунках будуць працаваць паралельныя секцыі (панэлі), на кожнай з якіх будзе прысутнічаць прадстаўнік еўракамісіі, каардынатар праекта і эксперт, якія адкажуць на любыя пытанні па праходжанні праектаў праз "сіта" ацэнак. За адзін працоўны дзень – з 9 раніцы да 5 вечара – можна будзе атрымаць масу карыснай інфармацыі, завязаць кантакты з партнёрамі, пазнаёміцца з брусельскімі службоўцамі, якія арганізуюць конкурсы і іх ацэнку.

Дадатковую інфармацыю пра біржу можна знайсці на сайце:

*http://www.net4society.eu/public/international-cooperation.*

**(Працяг на 4-й стар.)**

## З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

**ВАЖНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

З інфармацыяй па ўсіх кірунках і раздзелах праграм FP7 можна пазнаёміцца на сайце праграмы: *http://cordis.europa.eu/fp7*.

У Беларусі інфармацыя па гэтай тэматыцы маецца на вэб-сайце нацыянальнага офіса 7РП: www.fp7-nip.org.by.

Прадстаўнікі сацыяльна-гуманітарных навук могуць атрымаць дадатковую інфармацыю па пытаннях удзелу ў 7РП і біржы праектаў у нацыянальнай кантактнай асобы Л.Р. Цітарэнкі (**e-mail: larissa@bsu.by**, **служб. тэл. 259-74-07**).

Еўрапейская Камісія мае вэб-сайт па сацыяльна-эканамічных і гуманітарных дысцыплінах, які змяшчае масу карыснай інфармацыі па розных кірунках актыўнасці ў рамках дадзеных дысцыплін:

*http://ec.europa.eu/research/social-sciences*.

Усе новыя конкурсы апублікаваныя на наступным вэб-сайце: *http://cordis.europa.eu/fp7/dc/index.cfm?fuseaction=UserSite.FP7CallsPage*.

Праблемы, па якіх могуць удзельнічаць прадстаўнікі сацыяльна-эканамічных і гуманітарных дысцыплін, могуць быць знойдзеныя пад рубрыкамі: COOPERATION і CAPACITIES. Каб паглядзець тэматыку праектаў дадзенага кірунку, працуйце з інфармацыяй у гэтых рубрыках.

Каб запоўніць афіцыйную форму па пошуку патэнцыйных партнёраў новага праекта, калі ласка, адкрыйце адпаведную вэб-старонку. Там вы знойдзеце бланк, запаўненне і размяшчэнне якога на вэб-сайце дасць вам патэнцыйную магчымасць знайсці калегаў з іншых краін Еўропы:

*http://www.net4society.eu/public/partner-search-service*.

Калі вы хочаце спачатку знайсці партнёраў з Расіі, звяртайцеся да расійскай кантактнай асобы Анастасіі Гуравай на электронны адрас: *agura1@yandex.ru*.

Агульная інфармацыя па розных новых конкурсах знаходзіцца таксама на сайце:

*http://www.iserd.org.il/default.asp?id=894*.

У рамках кааперацыі прадстаўнікоў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін розных краін Еўропы быў створаны вэб-сайт, дзе вы можаце таксама знайсці шмат карыснага для сябе, а паслаўшы запыт праз гэты сайт, атрымаць кваліфікаваны адказ ад распрацоўнікаў сайта (прадстаўнікоў Германіі):

*http://www.net4society.eu/public/international-cooperation*.

**прафесар Ларыса ЦІТАРЭНКА,**
**прадстаўнік Нацыянальнай кантактнай кропкі па сац-гум. навуках па кааперацыі з 7 Рамачнай праграмай**

## ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ БДУ

**ЗАПРАШАЕ**
**студэнтаў 4-5 курсаў**
**і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй**
**на перападрыхтоўку**
**па спецыяльнасцях:**

**"АКТУАРНАЯ МАТЭМАТЫКА"**
(матэматык-фінансіст);
**"ПРЫКЛАДНАЯ МАТЭМАТЫКА"**
(матэматык-праграміст);
**"БУХГАЛТАРСКІ ЎЛІК І КАНТРОЛЬ У ПРАМЫСЛОВАСЦІ"**
(бухгалтар-эканаміст);
**"СУЧАСНАЯ ЗАМЕЖНАЯ МОВА (прадпрымальніцкая дзейнасць)"**
(перакладчык-рэферэнт англійскай мовы);
**"ПРАГРАМНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ СІСТЭМ"**
(інжынер-праграміст);
**"МЕНЕДЖМЕНТ ТУРЫСЦКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ"**
(менеджэр).

***Выдаецца дыплом дзяржаўнага ўзору.***
Форма навучання – вячэрняя і завочная.
**Адрас: вул. Маскоўская, 15, каб. 33.**
Тэл. (017) 328-53-85, 222-82-68, 209-54-38.
www.imo.bsu.by/fpk

## НДІ ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ БДУ

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**
***на замяшчэнне вакантнай пасады***
СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА
навукова-даследчай лабараторыі праблем бяспекі інфармацыйных тэхналогій.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, каб. 702, НДІ ППМІ, тэл. 209-51-04.

## НДІ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**
***на замяшчэнне вакантнай пасады***
НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА
лабараторыі электрадынамікі неаднародных асяроддзяў

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, каб. 315, тэл. 226-42-31.

## ЦЭНТР СІСТЭМНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ПРАБЛЕМ МОЛАДЗІ БДУ

***Аб'яўляе набор на 2009-2010 навучальны год***
*па адукацыйных праграмах:*

**ШКОЛА МЕНЕДЖМЕНТУ І ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА ДЛЯ МОЛАДЗІ. УЛАСНАЯ СПРАВА**
Кантынгент: студэнты, маладыя спецыялісты.
Кошт навучання – 412 070 рублёў.

**ШКОЛА ПОЛЬСКАЙ МОВЫ**
Кантынгент: навучэнцы ліцэяў, вышэйшых навучальных устаноў, маладыя спецыялісты, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў.
Кошт навучання – 290 000 рублёў за 1 год навучання.

*Тым, хто паспяхова прайшоў праграму навучання, выдаецца СЕРТЫФІКАТ БДУ*

***Тэрміны навучання:*** кастрычнік-май
***Кошт навучання:*** аплата ажыццяўляецца па дзяржаўных расцэнках у два этапы
***Рэжым заняткаў:*** 1-2 разы на тыдзень

Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, каб. 409 (Ст. метро "Плошча Леніна");
Тэл.: 8 (017) 209-51-52, факс: 8 (017) 209-55-18

## АБВЕШЧАНЫ КОНКУРС НА НАЙЛЕПШЫЯ НАВУКОВЫЯ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ БДУ

***Загадам БДУ ад 04.09.2009 №754-ПС абвешчаны конкурс на найлепшыя навуковыя працы студэнтаў.***

На конкурс прадастаўляюцца працы, выкананыя індывідуальна. У асобных выпадках пры наяўнасці абгрунтавання, падпісанага кіраўніком падраздзялення, дапускаецца ўдзел у конкурсе працы двух аўтараў. У конкурсе могуць удзельнічаць студэнты (у тым ліку магістранты), а таксама выпускнікі БДУ 2009 г. Наяўнасць навуковых публікацый для конкурсантаў абавязковая.

У рамках конкурсу прысуджаецца прэмія за найлепшую навуковую працу ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук і прэмія за найлепшую навуковую працу ў галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук. Памер прэмій пераможцам конкурсу складае не менш за 20 % прэмій імя А.Н. Сеўчанкі і У.І. Пічэты. Студэнты, працы якіх былі прадстаўлены на конкурс і атрымалі станоўчыя водгукі рэцэнзентаў, па рашэнні камісіі могуць быць прэміраваны ў памеры трох базавых велічынь.

Падрабязней азнаёміцца з тэкстам загада БДУ аб правядзенні конкурсу, палажэннем аб конкурсе і з правіламі афармлення прац, якія прадстаўляюцца на конкурс, можна на сайце аддзела НДРС БДУ (http://www.nirs.bsu.by, раздзел Дакументы / Конкурс найлепшых прац студэнтаў БДУ у галіне прыродазнаўчых і гуманітарных навук), а таксама на серверы БДУ (Агульныя папкі / Усе агульныя папкі / Навукова-даследчая работа студэнтаў / Конкурс БДУ).

Конкурсныя працы і неабходныя дакументы падаюцца да 28.09.2009 у аддзел НДРС (вул. Бабруйская, 9, каб. 418, з 14.00 да 17.15, тэл. 209-54-27).

Запрашаем студэнтаў, магістрантаў і выпускнікоў 2009 г. прыняць удзел у конкурсе.

**Аддзел НДРС упраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі НДЧ-ГУН**

## РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ

***Запрашае на перападрыхтоўку з кастрычніка 2009 г.***
выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных кірунках:

1. Інфармацыйна-ідэалагічная і выхаваўчая работа ва ўстановах адукацыі 05.10.2009 – 30.04.2010, 1 этап: 05.10 – 24.12 (вочная (па этапах));
2. Псіхалогія 05.10.2009 – 31.03.2011, 1 этап: 05.10 – 31.10, 2 этап: 30.11 – 24.12 (вочная (па этапах));
3. Справавое адміністраванне 05.10.2009 – 29.04.2011, 1 сесія: 05.10 – 31.10 (завочна);
4. Менеджмент устаноў прафесійнай адукацыі 26.10.2009 – 19.06.2011, 1 сесія: 26.10 – 20.11 (завочна);
5. Арганізацыя работы з моладдзю 28.09.2009 – 27.11.2010, 1 этап: 28.09 – 23.10, 2 этап: 23.11 – 24.12 (вочная (па этапах)).

**Для папярэдняга запісу ў групы тэлефануйце: 222-83-03, 200-20-47.**
**Адрас: 220007 г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, каб. 320, тэл./факс 200-25-51.**

## ДА ЎВАГІ АБІТУРЫЕНТАЎ!

**ВУЧЭБНЫ ЦЭНТР ФІЛАЛАГІЧНЫХ ПАСЛУГ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ**
***аб'яўляе набор слухачоў на падрыхтоўку:***

— да цэнтралізаванага тэсціравання па мовах (руская, беларуская, замежная);
— да ўступных іспытаў у навучальныя ўстановы па рускай і беларускай літаратуры.

Фарміруюцца групы слухачоў у колькасці 3 і 6 чалавек.
Выкладчыкі Цэнтра – высокакваліфікаваныя спецыялісты, дацэнты, кандыдаты навук.
Заняткі з кастрычніка 2009 г. па май 2010 г.

**Наш адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, аўд. 59. Тэл.: 222-33-65.**

## ДА ЎВАГІ СТУДЭНТАЎ!

**ВУЧЭБНЫ ЦЭНТР ФІЛАЛАГІЧНЫХ ПАСЛУГ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ**
***праводзіць набор на вячэрнія курсы па навучанні замежным мовам (англійская, нямецкая, італьянская, турэцкая, кітайская, іспанская)***

Кошт навучання за навучальны год (студэнты і супрацоўнікі БДУ):
**турэцкая мова** – 418070 рублёў;
**нямецкая, італьянская, іспанская, французская мовы** – 397340 рублёў;
**англійская, кітайская мовы** – 411160 рублёў.

Праграма курсаў разлічаная на 2,5 навучальныя гады (аплата ажыццяўляецца па семестрах).
**Заняткі праводзяцца на філалагічным факультэце БДУ (К. Маркса, 31).**
Па даведкі звяртацца ў аўд. 59 з 14.10 да 17.00 (тэл. 222-33-65).

**СТУДЭНТЫ 4-5 КУРСАЎ, ВЫПУСКНІКІ ВНУ, КАЛІ ВЫ ЖАДАЕЦЕ АТРЫМАЦЬ ЭКАНАМІЧНУЮ КВАЛІФІКАЦЫЮ,**

## ІНСТЫТУТ ТЭХНАЛОГІЙ ІНФАРМАТЫЗАЦЫІ І КІРАВАННЯ БДУ

***ЗАПРАШАЕ НА ПЕРАПАДРЫХТОЎКУ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ***

**"Інфармацыйнае і прававое забеспячэнне бізнэсу"**
*кваліфікацыя – эканаміст з веданнем права*
**"Праектаванне праграмнага забеспячэння інфармацыйных сістэм"**
*кваліфікацыя – праграміст-аналітык*
**"Эканамічная кібернетыка"**
*кваліфікацыя – матэматык-эканаміст*

***Прыём заяў у аўд. 739 па вул. Кальварыйская, 9 (тэл. 259-70-58), пр. Незалежнасці, 4, каб. 512 (тэл. 209-54-44)***

Навучанне да чэрвеня 2010 г., вячэрняе, 3-5 разоў на тыдзень.
Навучанне платнае, аплата ў растэрміноўку.
По заканчэнні навучання слухачы атрымліваюць дыплом аб перападрыхтоўцы на ўзроўні вышэйшай адукацыі дзяржаўнага ўзору.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць на сайце *www.itiubsu.by*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# МАЯ УНІВЕРСІТЭЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА

***Да Дня бібліятэк Беларусі, які адзначаецца 15 верасня, Фундаментальная бібліятэка БДУ пачала рыхтавацца аж за тыдзень. На ўсіх факультэтах у аддзелах абслугоўвання прайшоў шэраг акцый, якія дапамаглі бібліятэцы і чытачам наладзіць больш цесны кантакт.***



*На выставе "Універсітэцкая бібліятэка – гады плённага супрацоўніцтва"*

На юрыдычным факультэце, факультэтах журналістыкі і філасофіі і сацыяльных навук былі рады атрымаць ад чытачоў вучэбную літаратуру ў падарунак. Арганізавалі нават асобную выставу "Дары ўдзячных чытачоў", дзе прадставілі найлепшыя экзэмпляры. Так, у межах гэтай акцыі дырэктар НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі Ю.С. Харын перадаў бібліятэцы часопісы на замежных мовах: The annnals of Applied probability. – 2004-2008 гг. – 32 экз., The annnals of Probability. – 2005-2008 гг. – 34 экз.

Акцыя бясплатных дадатковых бібліятэчна-інфармацыйных паслуг была скіравана на тое, каб пайсці на ўступкі чытачам.

А перад самым святам, 14 верасня, быў дзень вернутай кнігі, у які бібліятэкары без аплаты прымалі назад кнігі, не здадзеныя своечасова.

У сам Дзень бібліятэк 15 верасня ветлівыя бібліятэкары студэнцкай чытальнай залы галоўнага корпуса універсітэта частавалі сваіх чытачоў гарачай гарбатай і прысмакамі.

Падчас свята высветлілася, што не толькі бібліятэкары цэняць тых, каго яны абслугоўваюць. Сярод чытачоў таксама шмат такіх, хто не толькі можа з цеплынёй назваць Фундаментальную бібліятэку БДУ сваёй, але і напісаць пра гэта. Студэнтам факультэта журналістыкі, а таксама філасофіі і сацыяльных навук, напрыклад, нямала прыйшлося папацець, каб стварыць уласныя эсэ на аналагічную тэму "Мая бібліятэка". У бібліятэцы на Кальварыйскай, 9 падвялі вынікі конкурсу "Чытач года", а яшчэ адкрылі куток "Прэса Ізраіля".

Трэба сказаць, што сэнс усіх выстаў і праглядаў, якія ладзіліся Фундаментальнай бібліятэкай БДУ ў гэтыя дні, зводзіўся да аднаго – паказаць вострую неабходнасць і зацікаўленасць адзін у адным як бібліятэкі, так і універсітэта.

Бібліятэкары пастараліся даць сваім наведвальнікам магчымасць пазнаёміцца з новымі перыядычнымі выданнямі па фізіцы, з працамі выкладчыкаў біялагічнага, гуманітарнага і радыёфізічнага факультэтаў, вучэбна-метадычнай і навуковай літаратурай, выдадзенай у БДУ. Бібліятэка заўсёды складала картатэкі па вучоных нашага універсітэта, персанальныя бібліяграфічныя паказальнікі выкладчыкаў, якія дапамагалі студэнтам у пошуку іх прац.

І паколькі любое свята – гэта ў нейкім сэнсе нагода, каб падвесці вынікі працы, то ў гэтыя дні быў зроблены і экскурс у мінулае. Аддзел рэдкай і каштоўнай кнігі Фундаментальнай бібліятэкі арганізаваў выставу "Вядомыя бібліятэкі мінулага". А ў чытальнай зале перыёдыкі факультэтаў журналістыкі і філасофіі і сацыяльных навук пастараліся з мінулага бібліятэчнай справы зазірнуць у будучае. Пра тое, якім яно можа быць, мажліва было даведацца падчас шматлікіх трэнінгаў і прэзентацый. Назва аднаго з трэнінгаў гаварыла сама за сябе – "Інфармацыйныя электронныя рэсурсы бібліятэкі БДУ і электронная дастаўка дакументаў", што сёння ўжо ўдала практыкуецца.

**Ганна ЛАГУН**

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА



*Супрацоўніца ФБ БДУ Ірына Чыкіронак дорыць кнігу Ул. Карызны пастаяннаму ўдзельніку літаратурных вечароў студэнту хімічнага факультэта Дзмітрыю Альшуку*

ВІНШУЕМ!

***Імянныя стыпендыі на 1 семестр 2009-2010 навучальнага года загадам рэктара прызначаны 29 студэнтам БДУ.***

**Стыпендыі імя Францыска Скарыны:** *Юлія Васяновіч* (5 курс біялагічнага факультэта); *Раксана Давыдава* (4 курс хімічнага факультэта); *Алена Голубева* (5 курс фізічнага факультэта); *Алена Панфілёнак* (5 курс ФРіЭ) і *Віталіна Дзежамесава* (5 курс ФПМІ).

**Стыпендыі імя Антона Сеўчанкі:** *Марына Лагацкая* (4 курс фізічнага факультэта); *Яўгенія Шынкевіч* (5 курс ФРіЭ); *Сяргей Ісаеў* (5 курс эканамічнага факультэта); *Дар'я Новічкава* (4 курс механіка-матэматычнага факультэта) і *Юрый Картыннік* (3 курс ФПМІ).

**Стыпендыю імя Максіма Багдановіча** заслужыў *Ільля Лапато* (4 курс Інстытута журналістыкі), **стыпендыю імя Петруся Броўкі** – *Уладзімір Сцяпанаў* (5 курс Інстытута журналістыкі).

**Стыпендыі імя Якуба Коласа** прызначаны *Святлане Рогач* (4 курс філалагічнага факультэта) і *Анастасіі Балмаковай* (5 курс геаграфічнага факультэта).

**Стыпендыі імя Янкі Купалы:** *Валянціна Войтава, Алена Ларыёнава* (абедзве – 4 курс філалагічнага факультэта); *Яўгенія Лустач* (4 курс факультэта міжнародных адносін).

**Стыпендыі імя Кандрата Крапівы:** *Маргарыта Латышкевіч, Уладзіслаў Парыцкі* (абодва – 4 курс філалагічнага факультэта); *Васіль Сурганаў* (5 курс юрыдычнага факультэта); *Дар'я Раманенка* (4 курс ФФСН); *Кацярына Камарова* (5 курс ФФСН); *Дзмітрый Анацка* (4 курс гістарычнага факультэта).

**Стыпендыі імя Івана Шамякіна:** *Іван Блізнец* (5 курс механіка-матэматычнага факультэта); *Марыя Плявака* (4 курс біялагічнага факультэта); *Крысціна Марчук* (3 курс юрыдычнага факультэта); *Марыя Даніловіч* (5 курс факультэта міжнародных адносін); *Дзмітрый Зайцаў* (5 курс гістарычнага факультэта).

**Стыпендыі імя Івана Навуменкі** ўдастоеная *Анастасія Албут* (4 курс філалагічнага факультэта).

Імянныя стыпендыі прызначаны ў адпаведнасці з Указамі Прэзідэнта ад 14 мая 2001 г., ад 29 снежня 2008 г. "Аб памерах дзяржаўных стыпендый навучэнскай моладзі" і з рашэннем Вучонага савета БДУ ад 7 верасня 2009 г.

ДАСЯГНЕННІ

# З МАСКОЎСКАГА САЛОНА

***Чатыры залатыя і два сярэбраныя медалі, а таксама іншыя ўзнагароды атрымалі распрацоўкі БДУ па выніках IX Маскоўскага міжнароднага салона інавацый і інвестыцый.***

Выставачнае мерапрыемства прайшло з 24 па 30 жніўня ў расійскай сталіцы. Залатых медалёў удастоеныя: канвертар сілкавання электрадугавых прыстасаванняў (НДІ прыкладных фізічных праблем імя А.Н.Сеўчанкі БДУ); супрацьпухлінны прэпарат "Цысплацел" (НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ); комплексы абсталявання для вытворчасці будаўнічых сэндвіч-панэляў і аўтаматызаваныя комплексы абсталявання для вытворчасці ізаляцыі электратэхнічных вырабаў з палімерных кампазіцый (НДІ ПФП імя А.Н.Сеўчанкі). Сярэбраныя медалі атрымалі: корпусны алмазазмяшчальны дыск для рэзання паўправадніковых пласцін на крышталі (НДІ ФХП), антыаксідантныя фітакампазіцыі серыі "Дабрадзея" і прадукцыя з іх выкарыстаннем (УП "Унітэхпрам БДУ").

Комплексы абсталявання для вытворчасці будаўнічых сэндвіч-панэляў сталі таксама ўладальнікамі спецыяльнага прыза Федэральнага савета па навуцы і тэхналогіях Расіі.

Дзве распрацоўкі атрымалі дыпломы: шматканальны апаратна-праграмны модуль збору і ўводу дадзеных для кампутарных сістэм кантролю, дыягностыкі і кіравання, а таксама сродак дэзінфіцыруючы "Навісан-1" для дэзінфекцыі абсталявання і памяшканняў перапрацоўчых прадпрыемстваў харчовай прамысловасці.

Навукова-тэхнічная прадукцыя БДУ была прадстаўленая ў складзе калектыўнага стэнда ДКНТ. Экспазіцыя БДУ ўключала 15 праектаў, 8 з іх удзельнічалі ў конкурсе інавацыйных распрацовак, і ўсе атрымалі ўзнагароды.

**Паводле інфармацыі НДЧ-ГУН**

З НАГОДЫ

# 10-годка ўдасканалення юстыцыі

***Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, супрацоўнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ з нагоды свайго 10-годдзя правёў у верасні міжнародную навукова-практычную канферэнцыю "Заканадаўства аб барацьбе са злачыннасцю: досвед рэфармавання і перспектывы развіцця".***

Адным з арганізатараў выступіў цэнтр "Усход-Захад" (Вялікабрытанія).

Адкрыў канферэнцыю дырэктар ІППК суддзяў, супрацоўнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі доктар юрыдычных навук, прафесар *Валерый Гадуноў*. Віталі гасцей і ўдзельнікаў рэктар БДУ акадэмік НАН Беларусі *Сяргей Абламейка*, старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь *Валянцін Сукала* і Генеральны пракурор нашай краіны доктар юрыдычных навук, прафесар *Рыгор Васілевіч*.

На канферэнцыі былі заслуханыя даклады: "Урокі рэформы крымінальнага заканадаўства ў Рэспубліцы Беларусь (1999-2009 гг.)"; "Перспектывы развіцця заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб барацьбе са злачыннасцю"; "Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь: праз дзесяць гадоў"; "Крымінальны закон і эфектыўнасць яго рэфармавання ў кантэксце судовай практыкі"; "Досвед рэфармавання сістэмы крымінальных санкцый і эфектыўнасць іх ужывання". Досведам Вялікабрытаніі па альтэрнатыўных мерах крымінальнага прымусу падзяліўся эксперт Брытанскага цэнтра "Усход-Захад" Лайанел Блэкман.

**Даведка**

Інстытут створаны ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 1998 г. для забеспячэння планавай і сістэмнай перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, супрацоўнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі. Адкрыўся 7 верасня 1999 г. З лістапада 2004 г. інстытут размяшчаецца ва ўласным навучальна-гасцінічным комплексе. Штогод у інстытуце павышае кваліфікацыю больш чым тысяча слухачоў.

Ва ўстанове працуе больш як 60 супрацоўнікаў, сярод якіх 5 дактароў і 9 кандыдатаў навук. Акрамя таго, заняткі праводзяць вядучыя навукоўцы юрыдычнага факультэта БДУ, кіраўнікі і суддзі Вярхоўнага, Вышэйшага Гаспадарчага і Канстытуцыйнага судоў Рэспублікі Беларусь, кіраўнікі і спецыялісты Генеральнай пракуратуры, Міністэрства юстыцыі і іншых дзяржаўных органаў і арганізацый.

**Кірыл ШОПІК**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Заканадаўства РБ аб барацьбе са злачыннасцю: вопыт рэфармавання і перспектывы развіцця"** да 10-годдзя Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі Беларусі БДУ – БелТА (09.09; 10.09); БелаПАН (10.09); "Минск-новости" (09.09).

**Інтэрв'ю з загадчыкам кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай БДУ Сяргеем Лебядзінскім** – "Настаўніцкая газета" (08.09).

**Стварэнне Савета маладых вучоных БДУ** – БелТА (07.09); БелаПАН (07.09); naviny.by (07.09); "Настаўніцкая газета" (10.09).

**Удзел студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ ў археалагічных раскопках у Мінску** – "Минский курьер" (04.09).

**Адкрыццё галерэі "Гісторыя беларускай пісьменнасці" на філалагічным факультэце БДУ** – "Минск-новости" (03.09); БелТА (04.09); БелаПАН (04.09); naviny.by (04.09); "Звязда" (05.09).

**Першакурснікі БДУ на адкрыцці сезона ў Купалаўскім тэатры** – БелТА (03.09); "Звязда"/"Чырвоная змена" (04.09); БелаПАН (04.09).

**Расійскія студэнты-першакурснікі БДУ** – "Советская Белоруссия" (03.09).

**Вылучэнне студэнткі БДУ Марыі Есьман на конкурс прыгажосці "Міс Інтэркантыненталь-2009"** – "Звязда" (01.09; 03.09); naviny.by (03.09).

**Перамогі ліцэістаў БДУ ў міжнародных спаборніцтваў па фізіцы** – "Рэспубліка" (01.09).

**Узнагароды за распрацоўкі вучоных БДУ на IX Маскоўскім міжнародным салоне інавацый і інвестыцый** – БелТА (31.08); "Минск-новости"(31.08); БелаПАН (31.08); "Народная газета" (03.09;10.09); "Настаўніцкая газета" (05.09).

**Святкаванне Дня ведаў у БДУ** – "Минск-новости" (28.08); БелаПАН (31.08); "Минский курьер" (02.09); "Вечерний Минск" (02.09); verso.ru (31.08).

**Засяленне ў інтэрнаты БДУ** – "БелТА" (21.08); "Интерфакс" (21.08); "Минск-новости" (21.08; 25.08); БелаПАН (23.08; 11.09); open.by (23.08); tut.by (23.08); "Советская Белоруссия" (25.08); "Звязда" (25.08); naviny.by (25.08); "Минский курьер" (25.08; 27.08); "Настаўніцкая газета" (27.08); "Вечерний Минск" (31.08).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВЫ ЧУЛІ?

# Унікальная дуброва гіне на вачах у студэнтаў

***Паміж чыгункай (на Баранавічы) і вуліцай Курчатава, каля вёскі Шчомысліца, знаходзіцца помнік прыроды "Дуброва". Гэта прыродны комплекс, дзе расліны маюць каштоўнасць не толькі як вельмі рэдкія экзэмпляры, але і як старажылы гэтых мясцін. Векавечныя дубы стаяць тут ужо некалькі стагоддзяў і з'яўляюцца для тутэйшых жыхароў чуллівым напамінам пра дзіцячыя гады ды маладосць (часам не толькі сваю, але і бацькоў, дзядоў). Дзіўна было даведацца, што запаведнаму месцу пагражае знішчэнне. Яшчэ больш здзівіў факт, што абаронцы гаю разлічваюцца за догляд флоры з уласнай кішэні.***



*250-гадовы дуб вельмі пацярпеў ад людской неахайнасці*



*Іван Гірыловіч*

Гэта гісторыя пачалася з тэлефоннага званка неабыякавай жыхаркі Маскоўскага раёна сталіцы Таццяны, якая ўсхвалявана звярнулася: "Рэліктавы гай гарыць! Гэта ўжо не першы раз! Няўжо нельга нічога зрабіць?"

Згодна з Палажэннем аб помніках прыроды ў Беларусі, такім лічыцца невялікі па плошчы унікальны прыродны аб'ект, які вызначаецца навуковай, культурна-пазнавальнай і эстэтычнай значнасцю. Сярод расліннага сусвету помнікамі з'яўляюцца раслінныя комплексы, якія вылучаюцца асабліва каштоўнымі відамі флоры. Цікава, што падобны комплекс знаходзіцца і ў Мінску. У адпаведнасці з рашэннем Камісіі Вярхоўнага Савета БССР па ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў ("Аб стане аховы і рацыянальным выкарыстанні лясоў зялёнай зоны горада Мінска" ад 05.09.1985 г.) і прапановай Міністэрства лясной гаспадаркі БССР Дзяржаўны камітэт БССР па ахове прыроды 24.03.1986 г. прыняў пастанову №7/8 "Аб абвяшчэнні дубровы каля вёскі Шчомысліца Мінскага раёна помнікам рэспубліканскага значэння". Сваю назву "Дуброва" ён атрымаў дзякуючы галоўнаму гонару комплексу – даўняму насаджэнню дубу чарэшчатага. Дубова-цемнахвойны лесавы фрагмент такога плана маецца толькі ў Лідскім раёне Гродзенскай вобласці. Ён унікальны тым, што гэта менавіта яловая дуброва. **Выканаўчы камітэт Мінскага абласнога Савета народных дэпутатаў рашэннем ад 22.07.1986 года перадаў увесь комплекс пад догляд БДУ.**

Па іроніі лёсу менавіта БДУ ўскосна мае дачыненне да знішчэння рэліктавага гаю. Справа ў тым, што гэтая мясціна знаходзіцца побач з біялагічным, гуманітарным і радыёфізічным факультэтамі. Таксама недалёка стаяць будынкі трэцяга і дзесятага інтэрнатаў альма-матэр. Няцяжка зразумець, што гэты арэал стаў месцам паломніцтва студэнтаў.

**Уваход у "Дуброву" свабодны. Невялікая брама адчынена для ўсіх ахвотных палюбавацца веліччу рэліктавай флоры. Але вока ўважлівага падарожніка міжволі чапляецца за выгаралыя ствалы, загубленыя дрэвы і горы смецця і перагарэлага вугалю, якія засталіся пасля разгульных шашлыкоў.**

– У комплексе "Дуброва" вельмі шмат раслін, цікавых для даследавання і вывучэння, – распавёў Іван Гірыловіч, інжынер-дэндролаг, біёлаг, выкладчык біялагічнага факультэта БДУ, суаўтар навуковага артыкула "Помнік прыроды рэспубліканскага значэння "Дуброва" ("Веснік БДУ", 2007, № 1), – тут каля 40 драўнінных відаў, у агульнай колькасці больш за 450 відаў раслін. За ўсёй грамадой, што сюды прыходзіць, не ўсачыць, ды і санкцый у нас няшмат. Мы толькі просім, каб патушылі вогнішча, не зрывалі раслін, але ў адказ часцей за ўсё чуем лаянку. Мы не маем права накладаць штрафы.

Хаця мясціна і знаходзіцца пад аховай дзяржавы, але на практыцы яна безабаронная. Сюды можа прыйсці любы жыхар мікрараёна, пашкодзіць любое дрэва і развесці вогнішча. Таму абаронцам флоры даводзіцца ўзімку самім зрубаць галінкі з пухнатых ялін, каб ахвотныя мець жывую прыгажуню ў навагодняй кватэры не пакваліліся на дрэўца. Наўмысна псуецца і вонкавы выгляд іншых раслін, якія можна прынесці дахаты.

На тэрыторыі комплексу знаходзіцца натуральная драўнінная расліннасць, якая ўключае ў сябе 39 відаў дрэў і кустоў з 27 родаў 17 сем'яў і прадстаўлена ліставымі і хваёвымі пародамі. У артыкулах, прысвечаных рэліктавай мясціне, кожны раз прыводзіцца засцерагальны заклік з шыльды ў самім гаі. Там паведамляецца, што **на тэрыторыі "Дубровы" нельга размяшчаць турыстычныя бівакі і палатачныя пляцоўкі, забараняецца ўсталяванне палатак, развядзенне вогнішча, засмечванне тэрыторыі бытавым смеццем і адкідамі, праезд, спыненне і абмыўка аўтатранспарту. Нельга пракладаць дарогі і пасвіць жывёлу. Забаронена псаваць і знішчаць драўнінна-кустовую расліннасць, збіраць травяныя расліны.** Аднак надпіс гэты даўно не абнаўляўся, таму вельмі важная інфармацыя не заўсёды звяртае на сябе ўвагу. Па выніках майго апытання, з дзесяці студэнтаў, якія жывуць побач з гаем, толькі трое ведалі пра яго рэліктавасць. Калі пачаць шукаць у сацыяльных сетках тыпу *vkontakte.ru* і *odnoklassniki.ru* сустрэчы, якія праходзілі ці збіраюцца адбыцца на тэрыторыі запаведнага гаю, то аб'яў можна знайсці незлічонае мноства. На вуліцы ж добрае надвор'е. На пакінутыя мною каментарыі, што запаведны гай вельмі старажытны і трэба было б абысціся без агню, ініцыятары сустрэч так і не прарэагавалі. Аднак арганізатар любога масавага мерапрыемства павінен браць на сябе адказнасць за яго правядзенне. Да таго, згодна з Палажэннем аб помніках прыроды ў Беларусі, зацверджаным Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя нашай краіны ад 28.02.1995 г., на тэрыторыях, дзе знаходзяцца помнікі прыроды, забараняюцца віды дзейнасці, якія пагражаюць яго зберажэнню.

Праілюстраваць чалавечую нядбайнасць можна здарэннем, якое адбылося на тэрыторыі комплексу сёлета ў чэрвені. Праз неакуратнае абыходжанне з агнём моцна пашкоджаны рэліктавы дуб, які ўпрыгожваў гай ужо на працягу 250 гадоў. Ён бачыў шмат: рэвалюцыю і дзве разбуральныя сусветныя вайны, ля яго каранёў пакаленні мясцовай дзятвы загадвалі жаданні, бо лічылася, што ён дзеліцца векавой мудрасцю і сілай з чалавекам, які да яго дакранецца. Цяпер ад драўлянага волата застаўся толькі абгарэлы ствол. Вяне вялізная карона. Біёлагі спрабуюць яго выратаваць, але працэс гэты больш нагадвае доўгую агонію. Чалавек, які тады выклікаў пажарнікаў, сам разлічыўся за выклік. Але ж шаноўнаму біёлагу (бо гэта быў наш суразмоўца Іван Гірыловіч) не столькі шкада было грошай са сваёй кішэні, як рэліктавага дрэва, якое загінула так выпадкова. Па словах Івана Сяргеевіча, шкода прыродзе больш істотная, чым грошы. А вось іншы чалавек пройдзе міма, каб толькі не быць западозраным у падпале і не панесці матэрыяльных страт.

Некаторыя прадпрыемствы маюць свае пажарныя каманды, якія будуць на месцы ўзгарання ўжо праз некалькі хвілін. Чаму ж не хапае іх на прыродны комплекс, які не мае ніякай абароны, акрамя старой шыльды з надпісам? Калі пытанне датычыцца матэрыяльных скарбаў, ад бяды заўсёды выстаўляецца сістэма аховы, а вось дрэва, якое вырасла само (хаця і рабіла яно гэта два з паловай стагоддзі), не кранае сэрца, а яшчэ больш – кішэню пераважнай часткі насельніцтва.

– Адказнасць за разбурэнне помніка прыроды кладзецца не толькі на студэнтаў, – заўважае наш суразмоўца, – людзі, якія жывуць побач, не цэняць дзіва прыроды, якое зберaглося ў межах горада.

З гэтымі словамі біёлаг паказаў на смецце, якое ляжала ўздоўж агароджы: мясцовыя жыхары выкідваюць яго на тэрыторыю комплексу. Іван Гірыловіч запэўнівае, што студэнты часцей за ўсё прыслухоўваюцца да просьбаў лесніка, а вось жыхары мікрараёна шмат разоў ігнаравалі яго словы і весяліліся далей, наносячы непапраўную шкоду прыродзе.

Часам людская неасцярожнасць, а пасля яе – абыякавасць могуць прывесці да катастрофы такога маштабу, што не стане неабходнай часткі флоры, каб надрукаваць падобны артыкул. Што казаць пра рэліктавыя насаджэнні, гісторыя якіх налічвае стагоддзі і стала гісторыяй кожнага з нас. Банальна гаварыць пра спадчыну, якую мы пакінем дзецям, таму што мы нічога не пакідаем нават сабе. Лакальны прыклад – комплекс "Дуброва", які за апошнія 10 гадоў зведаў катастрафічныя разбурэнні і дэградацыю насаджэнняў. Праблемай з'яўляецца і тое, што гай з усіх бакоў агароджаны будынкамі. Калі раней воды сцякалі ў лес, то зараз праз павышаны элемент рэльефу, праз забудовы, вада не даходзіць да комплексу ў неабходнай колькасці. Раней можна было назіраць забалочванне ў гэтай мясціне, а ў наш час вада проста сыходзіць. Таму шмат дрэў, а ў большасці менавіта дубовыя насаджэнні, знаходзяцца ў дрэнным стане.



*Шыльда з засцерагальным надпісам пры ўваходзе ў дуброву*

Мы нясём асаблівую адказнасць за дзейнасць студэнтаў нашай ВНУ, якая мае рэпутацыю не толькі інтэлектуальнай кузні Беларусі, але і асяродку маралі высокаадукаванай моладзі. Шкада, што некаторыя студэнты міжволі займаюцца разбурэннем рэліктаў, але ёсць і тыя, хто імкнецца зберагчы раслінную скарбніцу. На тэрыторыі комплексу мы заўважылі насаджэнне маладых дрэўцаў з шыльдачкамі, на якіх былі напісаны даты пасадкі, імёны "садаводаў". Зрабілі гэта студэнты факультэтаў, якія знаходзяцца побач. Цяпер яны могуць выкрасліць пункт "пасадзіў дрэва" з жыццёвага спіса. Як і пункт "дапамог не знікнуць расліннаму рэлікту" альбо "не застаўся абыякавым да праблемы знішчэння наваколля". Для нашай моладзі гэта сапраўды істотна, і яны робяць гэта не дзеля галачкі.

Калі гарадок настолькі маленькі, што і дзіцячы вазок лічыцца транспартным сродкам, любое здарэнне ўспрымаецца як падзея. Але калі горад налічвае мільёны жыхароў, то і катастрофу заўважаеш не адразу. Усе мы ведаем, што побач хаваецца людская злосць, элементарная неасцярожнасць, але адчуваем толькі цень. Не спрабуючы шукаць першапрычыны. Што ж, пакінуць сумны факт у сваёй свядомасці ці не быць абыякавым? Усё залежыць ад чалавека. Будзем спадзявацца, што колькасць разумных і прадбачлівых людзей большая, чым колькасць тых, хто рубіць сук, на якім сядзіць, а таксама абывацеляў, якія жывуць па прынцыпе "мая хата з краю" і не ўсведамляюць сумных наступстваў такога падыходу для сябе і нашчадкаў.

**Кацярына РАМАНАВА**

*P.S.* Кожнае лета універсітэцкі БРСМ фарміруе студэнцкія атрады, якія займаюцца добраўпарадкаваннем гарадскіх аб'ектаў. Сярод іх адзін – экалагічны – прыбіраў тэрыторыю музея ў Вязынцы, а сельскагаспадарчы працаваў зусім побач – у Шчомысліцы. Ці не варта было б звярнуць увагу на тое, што робіцца пад самым бокам, з уласным падапечным, каб студэнтам не сорамна было глядзець у вочы мясцовым жыхарам і сваім прыкладам паказаць павагу да старажытнага гаю. Унікальнасць нашай дубровы заслугоўвае пастаяннага клопату пра яе.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

17 верасня 2009 года
Падпісана да друку 15.09.2009 г.
Зак. 929. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*